САВЕТ ФЕДЭРАЦЫІ
ПРАФСАЮЗАУ БЕЛАРУСІ

ПРЭЗІДЫУМ

ПАСТАНОВА

СОВЕТ ФЕДЕРАЦИИ
ПРОФСОЮЗОВ БЕЛАРУСИ

ПРЕЗИДИУМ

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

26.08.2016 № 300

г.Мінск г.Минск

Аб прэміях Федэрацыі прафсаюзау Беларусі
2017 года у галіне літаратуры, мастацтва,
журналістыкі і аматарскай творчасці

Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзау Беларусі ПАСТАНАУЛЯЕ:

1. Устанавіць на 2017 год наступныя прэміі Федэрацыі прафсаюзау Беларусі у галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці:

1.1. пяць прэміі у галіне літаратуры і мастацтва, у тым ліку:

за творы прозы, паэзіі і драматургіі – адна прэмія;

за музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць – адна прэмія;

за работы у галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва – адна прэмія;

за творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва – адна прэмія;

за лепшы твор аб прафсаюзах – адна прэмія;

1.2. адну прэмію за актыуную работу па развіцці народнага мастацтва і аматарскай творчасці працоуных (сярод кіраунікоу прадпрыемствау і арганізацый, прафсаюзных і ведамасных установу культуры, старшынь прафсаюзных арганізацый);

1.3. адну прэмію за выдатныя дасягненні аматарскіх калектывау мастацкай творчасці;

1.4. адну прэмію у галіне журналістыкі.

2. Колькасць саіскальнікау на атрыманне прэміі ФПБ у складзе калектыву аутарау не павінна перавышаць чатырох чалавек.

3. Памер прэміі Федэрацыі прафсаюзау Беларусі 2017 года устанавіць пры прыняцці рашэння аб іх прысуджэнні.

4. Галоунаму фінансава-эканамічнаму упрауленню апарату Савета ФПБ прадугледзець неабходныя сродкі на выплату грашовых узнагарод лаурэатам, выраб Ганаровых знакау і Дыпломау, правядзенне ушанавання лаурэатау.

5. Унітарнаму прадпрыемству "Дом прафсаюзау" (Л.Б.Багушэвіч) забяспечыць выраб да 1 красавіка 2017 г. Ганаровых знакау і Дыпломау лаурэатау прэміі Федэрацыі прафсаюзау Беларусі.

Старшыня
Федэрацыі прафсаюзау М.С.Орда

документов
Республиканский комитет
Белорусского профсоюза
работников здравоохранения
05 09 16
№ 1642